КРЫВІНКА

КРАСАВІК
№ 6 (68)
2010 год

ІНФАРМАЦЫЙНА-КУЛЬТУРНАЯ ГАЗЕТА БЕШАНКОВІЦКАГА РАЁНА

"Нельга есці хлеб народа і грэбаваць ягонай мовай".
Ул. Караткевіч.

http://haradok.belarda.org - сайт нашага рэгіёна

ГУЛЬНЯ Ў ДЭМАКРАТЫЮ

Мая скарга ў абласную выбарчую камісію, якую я адаслаў паўторна лістом ад 6.04., разглядалася толькі 15-га красавіка. Пісьмовы ж адказ на яе я атрымаў толькі праз 5 дзён, то бок 20-га. Там стаяла прыкладна тое ж, што і ў рашэнні раённай камісіі. То бок пра неадпаведнасць майго выступу і пра мае парушэнні выбарчага кодэксу РБ.

Назаўтра мною быў накіраваны ліст са скаргаю ў цэнтральную выбарчую камісію. Ужо 23-га красавіка я атрымаў адказ. Там стаяла наступнае: "Рашэнне Бешанковіцкай раённай выбарчай камісіі з'яўляецца неабгрунтаваным і Вам будзе прадастаўлена магчымасць выступіць па раённым радыё. Адпаведныя ўказанні дадзены Віцебскай абласной і Бешанковіцкай раённай выбарчай камісіям. Старшыня камісіі Л.Ярмошына."

Чаму ж раённая і нават абласная выбарчыя камісіі "не разабраліся" як след у маім выступленні і па сутнасці сарвалі маю перадвыбарчую кампанію? Няўжо ў камісіях бракавала прафесіяналаў? Адказ просты. Абедзьве камісіі працавалі зыходзячы з ранейшай устаноўкі, што праводзілася ў жыццё апошнія 15 гадоў. А яна была вельмі простая –"Апазіцыю да выбараў не пушчаць!"

Камісіі ў нашых выбарчых кампаніях набіраюцца з асобаў, якія амаль усе апошнія 15 гадоў застаюцца нязменнымі. Як я мог упэўніцца, члены такіх камісій не толькі не маюць сваёй думкі, але маюць поўнае супадзенне з думкай старшыні камісіі. А на пасаду старшыні выпадковыя людзі не трапляюць. Трэба думаць, што тыя старшыні поўнасцю выканалі ўстаноўку ЦВК. Бо свой выступ на радыё я атрымаў у апошні дзень папярэдняга галасавання, калі прагаласавала ўжо каля 30% выбарцаў.

Пазіцыю ж ЦВК у адносінах да мяне можна патлумачыць так. Спадарыня Ярмошына імкнецца выглядзець дэмакраткай. Бо ёй вельмі ўжо хочацца ў Эўропу. Зарплата ў яе салідная, грошай на круізы хапае, не стае толькі дазволу кампетэнтных эўрапейскіх органаў. Чаму ж не даць той выступ нейкаму настаўніку з нейкіх Бешанковіч? Лічыць жа галасы мы ўмеем. А ўзамен можна атрымаць самую Эўропу!

Я ж яшчэ раз змог упэўніцца ў тым, што да сапраўды дэмакратычных выбараў нам трэба ісці і ісці доўгай і цяжкай дарогай.

Г.Станкевіч, кандыдат у дэпутаты па Пушкінскай акрузе №12.

Вясковыя сьцежкі дзяцінства

Птушыным сагрэтыя сьвістам,
Скарынкаю сытыя хлеба,
Вясковыя сьцежкі дзяцінства
Мне шлях разнасьцежвалі ў неба.

Ад кожнай вясковае хаты
Бруіліся, быццам крыніцы.
Прыемна халодзілі пяты
І сэрца прысьпешвалі біцца.

Імчалі наўпрост цераз поле,
Дзе ніўку агорваў араты,
Лучылі ў адно навакольле --
Лугі, расьцяробы і хаты.

Вялі нацянькі да бабулі
Старымі кладамі ля гаю.
У прыцемках зморaных чулі,
Як маці дахаты гукае.

Вялі неўпрыкмет у юнацтва,
Ў віры гарадзкія вакзалаў.
Са сьцежак мой сьвет пачынаўся,
Шляхоў-бальшакоў бракавала.

І сёньня ад сытага сьвінства
У снах я сюды уцякаю.
Па росных сьцяжынах дзяцінства
Да самага раньня блукаю.

18.01.2010

ГАРЫ-ГАРЫ ЯСНА!

Чым хутчэй вясна набліжаецца ў нашы краі, тым усё павялічваецца армія аматараў вясновых падпалаў. Як толькі пад цёплымі сонечнымі промнямі падсыхае зямля, а з ёй і рэшткі расліннасці, што пакінула нам восень, то тут, то там пачынаюць уздымацца ў паветра сінія струменьчыкі дыму. І каб толькі струменьчыкі! Парой бушуе такі агонь, які абдымае ўсё наваколле і пажырае на сваім шляху ўсё жывое. Тое, што на адмерлых рэшутках знаходзяць сабе прыстанак тысячы відаў жывых арганізмаў, здаецца, нікога не хвалюе. Ну пра якіх жучкоў-павучкоў мы будзем задумвацца, калі на вачах можа адбыцца такі цуд: паднёс запалку – і вогненная стыхія ўмомант змяняе ўвесь краявід.

Пра тое, што агонь наносіць сур'ёзную шкоду наваколлю, напісаны сотні і тысячы артыкулаў. І ўсё адно кожная вясковая гаспадыня лічыць за норму развесці на сваім падворку вогнішча, каб іншыя не папракнулі яе ў нядбайнасці. І гараць у тым вогнішчы лісце і быльнёг, папера і салома, то бок усё тое, аб механізме знікнення чаго прырода даўно паклапацілася. Усё тое за колькі часу мірна, без агню і дыму, згнівае ў зямлі. Не перагружаючы зямную атмасферу дадатковай колькасцю дыму. Не знішчаючы нікога з нашых маленькіх братоў па жыцці на Зямлі.

Змагацца з самапаламі амаль немагчыма. У ясныя сонечныя дні густыя клубы дыма валяць з усіх бакоў. Але пакідаць справу так, як яна ёсць нельга. Але адна справа, калі нейкая дбайная гаспадыня развяла на сваім падворку вогнішча, каб спаліць там колькі сучкоў і травы. І зусім іншая справа, калі на пал свядома накіроўваюцца калгасныя спецыялісты, каб знішчыць сляды сваёй безгаспадарчасці і аблегчыць працу плугарам ды касцам. Здаецца, ніводзін з тых спяцоў нават не быў папярэджаны, не тое, каб пакараны.

На здымку: у Бешанковічах паляць смецце.

Л.Паўлава.

ТВАР УЛАДЫ,

АБО Ў ЯКУЮ СУМУ АБЫХОДЗІЦЦА ПАДАТКАПЛАЦЕЛЬНІКАМ УТРЫМАННЕ ЧЫСЦІНІ НА ГАЛОЎНЫМ ПЛЯЦУ БЕШАНКОВІЧАЎ

Калі вам даводзілася наведваць Бешанковічы ў апошні час, вы несумненна звярнулі ўвагу на людзей, якія ў жоўтых камізэльках кучкамі па двое-трое сноўдаюцца ў раёне цэнтральнага пляца. Звычайна яны ўзброены мётламі ці нейкім яшчэ няхітрым інструментам. Іх можна сустрэць на вуліцы Валадарскага ад дома старшыні райвыканкама да скрыжавання з вуліцай Інтэрнацыянальнай, ці ад будынка аўтавакзала да райвыканкама. Гэтыя 10-12 чалавек клапоцяцца аб чысціні "пупа" нашага горада – райвыканкама і прылягаючай да яго тэрыторыі. Тая тэрыторыя чысціцца-падмятаецца, каб насельнікі і госці нашага горада бачылі, што ўлада прыкладае значныя намаганні, каб наш твар меў адпаведны выгляд.

Я не супраць таго, каб Бешанковічы мелі прывабны выгляд. Але ці лічыў хто, у якую суму абыходзіцца тая "касметыка"? Ці не прасцей і сучасней наводзіць чысціню машынамі, а не арміяй беспрацоўных з вядром і мятлой?

Зробім простыя падлікі. Тыя людзі, якія штодня шчыруюць на пляцу, атрымоўваюць штомесяц мінімум 350 000. Слаба верыцца што менш, і малаверагодна, што больш. То бок, за месяц на ўтрыманне нашага цэнтральнага пляцу выдаткоўваецца каля 4 мільёнаў. За год – каля 50-ці. Сума, за якую цалкам рэальна набыць нейкую сучасную тэхніку, якая так патрэбна камунгасу, каб утрымліваць у чысціні не толькі твар горада, але і яго іншыя больш далікатныя часткі. Тое, што тэхнікі ў камунгасе кот наплакаў, вядома кіраўнікам раёна не горш, чым нам з вамі. Няма тут ні снегаўборачнай тэхнікі, бракуе і на сучасныя смеццезбіральныя машыны. Затое хапае сродкаў на тое, каб утрымліваць армію смеццезбіральнікаў, якія да бляску адчышчаюць твар гэтай улады.

Г.Станкевіч.

АБ'ЯВА

- ***Кабатрымлівацькожны нумар газеты «Крывінка» паведаміце рэдакцыі аб гэтым – зрабіце бесплатную падпіску.***
- ***Рэдакцыя «Крывінка» змяшчае бясплатныя абвесткі чытачоў выдання. Дзеляразмяшчэннянабвесткі запоўніце купон або патэлефануйце ў рэдакцыю.***
- ***Калі парушаны вашы правы спажыўца, працаўніка, то даем эфектыўныя парады па абароне права і пошуку бясплатных юрыстаў. Звяртайцеся на адрас газеты «Крывінка».***
- ***Рэдакцыя запрашае да супрацоўніцтва неабыякавых грамадзян. Вашы навіны, паведамленні – нашая падзяка. Словам, сувенірам.***

"Крывінка" ў Інтэрнэце

Шаноўны чытач! Раней чым з паштовай скрыні вы можаце чытаць нашу газету ў Інтэрнэце. Газета размешчана для спампавання на сайце http://haradok.belarda.org/ у раздзеле "Незалежныя выданні" на старонцы "Крывінка".

Вынікі апошняга апытання на сайце http://haradok.belarda.org/

Ці магчымы на Беларусі кіргізкі сцэнар?

Не	46%
Магчыма, калі ўзрасце жабрацтва	22%
Магчыма, калі ўзрасце карупцыя	18%
Магчыма, калі ўзмацніцца апазіцыя	4%
Магчыма, калі пажадае Расія	10%

Заказ выкананы!

Суд над "Крывінкай" адбыўся толькі 19 красавіка, але гэта цалкам задавальняла заказчыкаў гэтага працэсу, і амаль поўнасцю зрывала маю падрыхтоўку да выбараў. Прыходзілася губляць час, растрачваць дарэмна сілы на забаву, сэнс якой яскрава вымалёўваўся словамі: "Крывінка" і яе рэдактар павінны замоўкнуць.

Усё тое я добра разумеў, а таму мяне асабліва не здзівіў судовы вырак. Я быў да яго цалкам гатовы. Гучаў ён так – пакараць заснавальніка і галоўнага рэдактара газеты "Крывінка" за "незаконны распаўсюд" у памеры 20-ці базавых велічынь, то бок 700 000 беларускіх рублёў. Суд яшчэ праявіў да апазіцыянера неверагодную "мяккасць", бо максімальнае пакаранне цягнула на 1млн 750 000.

Тым не менш я абсалютна ўпэўнены, што гэта справа ўзнікла толькі з-за майго ўдзелу ў выбарах. То бок, яна цалкам палітычная. А заказ на яе, на маю думку, мог паступіць толькі з райвыканкама. Хто ж яшчэ, як не раённы ідэалагічны аддзел можа так бязлітасна караць тых, хто пасягае на яго манаполію на "праўду"?

Толькі вось суду, пэўна, невядомы некаторыя дакументы, якія ён зняважыў. І галоўны з іх – Канстытуцыя рэспублікі Беларусь, якая гарантуе свабоду слова. А яшчэ шэраг міжнародных актаў і дагавораў, парушэнне якіх сведчыць аб абмежаванні правоў і свабод у нашай краіне. Калі нашым заказчыкам не захочацца мець справу з міжнародным судом па правах чалавека, то гэты цалкам незаконны судовы вырак прыйдзецца адмяніць. Адпаведныя паперы мною падрыхтаваны і накіраваны ў абласны суд 27-га красавіка.

Г.Станкевіч, кандыдат у дэпутаты па Пушкінскай акрузе №12.

Вынікі выбараў 25-га красавіка

На першы погляд выбары тыя прайшлі нібыта ў савецкія часы – пры поўнай падтрымцы існуючай улады. А як жа! Усе дэпутаты абраныя з яўнай перавагай у галасах. Прагаласавала больш 90 % насельніцтва раёна. Здаецца, амаль поўнае аднадушша. Нават па тых двух акругах, дзе ішлі кандыдаты не ад улады, ім не ўдалося набраць і траціны галасоў выбарцаў. Але, калі затрымаць позірк на графе "Колькасць галасоў супраць кандыдата", то заўважыш, што не ўсё так гладка на паперы. Бо па некаторых акругах гэта лічба трохзначная або блізкая да яе. І перавага кандыдата, які прадстаўляе ўладу, амаль эфімерная.

Калі верыць афіцыйнай статыстыцы выбараў, асаблівай непапулярнасцю на сяле карыстаюцца старшыні калгасаў у Драздах і Бачэйкаве. Супраць іх пададзена адпаведна 144 і 114 галасоў. Амаль 100 чалавек з 446-ці супраць, каб іхнія інтарэсы ў раённым Савеце прадстаўляў галоўны ўрач раённай бальніцы. Ды што там казаць: па афіцыйных дадзеных 88 чалавек па Сініцкай выбарчай акрузе асмеліліся прагаласаваць супраць самаго сп. Шведава! Усё тое сведчыць, што пра поўную падтрымку праводзімага курсу не можа быць аніякай размовы. Улада напісала, што больш 2000 выбаршчыкаў прагаласавала супраць кандыдатаў ад улады.

У абсалютнай большасці сельскіх акруг, як напісалі участковыя камісіі, не прынялі ў галасаванні лічаныя асобы – ад 5 да 10 чалавек на акругу. У той жа час у горадзе па трох акругах не галасавалі адпаведна 67, 70 і 78 выбарцаў. Магчыма, што колькасць негаласаваўшых магла быць значна вышэйшай. Каб падвысіць лічбу выбарцаў, прыкладам, у Драздах у магазін завезлі да выбараў 50 скрыняў віна. І нават у гэтай сітуацыі 144 чалавекі тут прагаласавалі супраць прадстаўніка ўлады.

Калі ж улічыць, што ўсе кандыдаты ад улады ішлі на выбары не самі, а іх размеркавалі строга па спісу на безальтэрнатыўнай аснове, то можна сказаць, што ніякіх выбараў у сутнасці не было. Тым больш, той, хто размяркоўваў кандыдатаў, сам прынімаў непасрэдны ўдзел у арганізацыі і правядзенні выбараў, а таксама і падліку галасоў.

Да сапраўды дэмакратычных выбараў у Бешанковічах не дараслі.

Г.Станкевіч.

ПАЧАЛАСЯ ПАСЯЎНАЯ

Прызнакам яе служыць магутная тэхніка, якая лётае туды-сюды па ваколіцах нашай вёскі, абуджаючы ўсё наваколле. Трэба заўважыць, што сёлета сельгаспрадпрыемства "Ржаўка" ўзялося за працу вельмі шчыра. Прынамсі ніводнае поле не засяваецца, папярэдне не сабраўшы з яго каменне. Вялікія крушні яго то там, то сям ўзвышаюцца блізу палеткаў. Праўда, доўга яны не ляжаць. Бо прадпрымальныя людзі паспяваюць адгрузіць тое каменне для сваіх пільных патрэб. У нашае ж мясцовае ўлады, якая была пільна занята выбарамі, каменне тое не выклікала, на жаль, аніякага інтарэсу. А дарэмна. Бо яно з'яўляецца не толькі выдатным будаўнічым матэрыялам, але і прыгодна для рамонту нашых дашчэнту занядбаных дарог і вуліц.

У тым самым сельгаспрадпрыемстве "Ржаўка" большасць вуліц праз вёскі разбітыя. І зроблена тое не без удзелу цяжкой сельскагаспадарчай тэхнікі. Чаму б тыя каменні не накіраваць на іхні рамонт. Як вядома, і пра тое пісала ў свой час "Крывінка", няма аніякай дарогі да Верхнякрывінскіх могілак. Асабліва разбітыя на той дарозе некалькі пераездаў праз ручаі, якія можна было б засыпаць каменнем.

Але чамусьці сёлета, як і летась і залетась, інтарэс да гэтага каштоўнага будаўнічага матэрыялу праяўляюць толькі тыя чыноўнікі, якія маюць на ўвазе свае патрэбы. Каб потым з таго камення будаваць падмуркі, рабіць файныя агароджы або брукаваць двары. Нам жа застаецца куляцца па разбітых вуліцах ды чакаць, калі ў нашыя вёскі завітае нехта накшталт спадара Прэзідэнта. Тады іх прыліжуць і падрамантуюць.

Г.Мікалаеў.

ЗНІШЧАЕЦЦА ГІСТОРЫЯ

Паводле аднаго са шматлікіх дэкрэтаў Прэзідэнта, нежылыя дамы ў нашых вёсках падлягаюць знішчэнню. Па-першае, яны псуюць сваім выглядам наваколле. Так сказаць, змяншаюць асалоду ад прыгожага шчаслівага жыцця, якую на сяле мусяць піць напоўніцу. Па-другое, з'яўляюцца пажаранебяспечнымі аб'ектамі, што могуць наклікаць бяду на ўсю вёску. Па-трэцяе, проста займаюць месца, на якім маглі б стаяць новыя катэджы аграгарадкоў.

А таму яны з'яўляюцца галаўным болем для старшынь сельсаветаў, якія пішуць стосы прадпісанняў да ўладальнікаў ці нашчадкаў тых уладальнікаў. А таму тыя старшыні з'яўляюцца да тых хацін ворагамі №1. Больш таго, многія з хат яшчэ моцныя і цалкам падыходзяць не толькі на тое, каб стаць дрывамі, але і будматэрыялам для нейкага гумна ці хлеўчука. А таму нямалыя грошы, якія запланаваны ў бюджэце на знос кожнай з хацін, асвойваюцца з лёгкасцю. Як вядома, ламаць – не будаваць.

Вось і з'яўляюцца сярод вёсак новыя і новыя плешыны, нібы могілкі, засыпаныя жоўтым пясочкам, ды курганкі разваленых печак. Неўзабаве ж яны парастуць быльнягом, і цяжка будзе нават уявіць, што тут цягам некалькіх стагоддзяў цякло людское жыццё. Што тут нараджаліся і паміралі сыны і дочкі гэтай гаротнай зямлі. Чые сляды яшчэ існуюць на мясцовых могілках і чые нашчадкі жывуць яшчэ, мабыць, па бяскрайніх прасторах СНГ.

Разам з гісторыяй вёсак нішчыцца і шмат гістарычных экспанатаў, якія, несумненна, ёсць на кожнай сядзібе. І па-гаспадарску трэба было б у тым прэзідэнцкім дэкрэце прадугледзець яшчэ адзін пункт. Што зносіць старыя будынкі можна толькі пасля іх абследвання мясцовымі краязнаўцамі. Бо гарышчы і сцены тых хацін маюць сотні і тысячы гістарычных экспанатаў, якія парой маюць велізарную каштоўнасць. Няхай бы хоць яны занялі месца ў нашых музеях.

Не ведаю як вам, а мне балюча ўявіць, што некалі па нечым загадзе да майго роднага дома пад'едуць людзі, якія раскідаюць яго дарэшты. А на тым месцы, дзе прайшла самая шчасная пара майго жыцця вырасце быльнёг.

На здымку: рэшткі разбуранай сялібы ў вёсцы Пяцігарск.

Г.Станкевіч.

ВУЛІЦА ІМЯ ЧКАЛАВА

Яна мае выгляд, які з'яўляецца тыповым на пачатку 21-га стагоддзя для вуліц беларускага райцэнтра, што ляжаць на перыферыі. Вуліца Чкалава ў гэтым плане не выключэнне.

Дагледжаныя ўтульныя хацінкі, што патанаюць вясной у квецені. Маленькія чысценькія заасфальтаваныя ці выбрукаваныя дворыкі. І кантрастам да іх сама вуліца. Без асфальтавага пакрыцця, яна бачыць грэйдэр толькі двойчы на год: вясной і перад чарговымі выбарамі.

Але сёлета і вясной, нягледзечы на выбары вуліцу не прагрэйдэравалі. Летась тут праводзіліся работы па падключэнню да прыроднага газу. Вуліцу перакапалі, трубу паклалі, траншэю трохі зараўнялі і на гэтым дабраўпарадкаванне вуліцы, як гэта ў нас прынята, спынілася. Гэтай вясной па ёй нельга было ехаць не тое што на машыне ці трактары. Нават на ровары прыходзілася рухацца асцярожна, па самаму краі, штомомант рызыкуючы аступіцца і трапіць у глыбокія каляюкі, налітыя да краёў вадою. Ствараецца ўражанне, што недзе на самай гары струменіць крыніца, якая папаўняе запасы той вады. А мо так яно і ёсць на самой справе, бо крыніцы любяць выходзіць на схілах.

Так ці інакш, але вуліца імя Чкалава сёння застаецца адной з самых занядбаных вуліц райцэнтра. Тут няма нават размовы пра нейкія ходнікі – прывесці б крыху ў людскі стан дарожнае пакрыццё. Колькі будзе выпрабоўвацца цярпенне рахманага мясцовага люду, ведаюць, мусіць, толькі мясцовыя чыноўнікі, якія некалі запланаюць тут рамонт. Пакуль жа мне асабіста сорамна за вядомага расейскага лётчыка, які, мусіць, і не ведае, як ганьбіцца сёння яго імя ў далёкай Беларусі.

Г.Станкевіч.

Памыць аўтамабіль

Гэту працу некаторыя аўтамабілісты робяць штодня. Гэта звычайна тыя, хто толькі набыў свайго чатырохколавага сябра. Іншыя робяць генеральную мыйку толькі раз у год – перад тэхаглядам. Але большасць аўтааматараў рэгулярна клапоціцца пра чысціню свайго аўта. Але дзе яго дазваляецца памыць?

Чамусьці бальшыня беларусаў лічыць за норму мыць сваю бліскучую машыну ў найчысцейшай вадзе. Гэта значыць на берагах нашых рэчак і азёраў. І не проста на берагах, а ў непасрэднай блізкасці ад вады. Бо працалюбівыя шчырыя беларусы ў апошнія сотню гадоў не вельмі прывыклі абцяжарваць сябе працай, а тут трэба яшчэ несці ваду здаля.

Колькі разоў за сёлетнюю вясну прыходзілася мне "ганяць" з берагоў Крывінкі такіх аўтааматараў! Цэлая калекцыя фатаздымкаў утварылася на лічбавіку. І бальшыня аматараў чысціні чамусьці любіць распачынаць мыйку непасрэдна на мосце. Яны як бы не ведаюць, што брудная вада з рэшткамі мазуту цячэ наўпрост туды, куды яны самі праз месяц-другі будуць даваць нырца. Праўда, мыйшчыкі лічаць, што бруд да таго часу сплыве. Але шкода, якая прычыняецца наваколлю, не сплыве нікуды.

А з іншага боку, у нас на беразе рэчак нідзе няма засцерагальных надпісаў: "Водаахоўная зона". Шыльды з такімі надпісамі можна ўбачыць скрозь у Нямеччыне яшчэ воддаль ад рэчак і азёраў. Яны адразу насцярожваюць і прымушаюць любога задумацца. І яны з'яўляліся б пэўнай падтрымкай для тых, хто вядзе барацьбу з мыйшчыкамі. Бо некаторыя парушальнікі адмаўляюца прызнаваць сваю правіннасць.

Урэшце, а чаму б у Бешанковічах сапраўды не абсталяваць недарагую аўтамыйку? Каб за 5 000 бел рублёў за кароткі час дарэшты прапыласосіць і вымыць свайго сябра. Паверце, за такія грошы туды б ездзілі ўсе. Нават утвараліся б чэргі. Лічыце гэта за чарговую ініцыятыву "Крывінкі". А выгоду ад мыйкі падлічыце самі. 2000 аўтамабіляў пры наведванні раз на месяц мыйкі прынясуць раённаму бюджэту (пры кошце 5 000 рублёў за адну мыйку) 120 000 000 рублёў!

На здымку: чарговая машына мыецца на Крывінцы.

Г.Станкевіч.

ПОСЛАНИЯ ГЛАВЫ ГОСУДАРСТВА: СЛОВА И ДЕЛА

С ежегодным посланием к Национальному собранию и народу Александр Лукашенко обратится 20 апреля. Накануне мы просмотрели его выступления последних трех лет и сравнили, как реализуются его слова на деле.

Вот лишь некоторые тезисы, которыми ублажал слух своих граждан в ежегодных посланиях президент.

Слово: «Неоспоримым преимуществом нашей модели экономического развития является то, что мы не влезли в долги. Кредит – это капкан, в который попадем даже не мы, а наши дети и внуки. Ни в коем случае нельзя допустить, чтобы кредит превратился в средство давления на нашу страну». (2007 год)

Дело: Тот факт, что наша страна все прочнее садится на кредитную иглу, с каждым годом наращивая темпы заимствований, уже не вызывает ни у кого сомнений. К 2010 году Беларусь успела наскрести по сусекам кредитов на 22 млрд долларов и, судя по всему, не собирается останавливаться на достигнутом. Поменялась и риторика главы государства: в 2009 году он уже заявлял, что, получив международные кредиты, наша страна получила «запас прочности» и ни слова о жизни без долгов как о неоспоримом преимуществе нашей экономической модели.

Слово: «В последнее время, особенно в России многие ёрничают: неужели Лукашенко повезет из Азербайджана, Ирана и Венесуэлы нефть в Беларусь, когда российская выгоднее. Конечно, не повезет». (2007)

Дело: Не прошло и трех лет, как венесуэльская нефть прямиком отправилась в наши края. По железнодорожным путям через Одессу уже побежали первые вагоны с черным золотом. И хоть объемы и экономическая выгода такой сделки выглядят сомнительно, в России уже не ёрничают. Там прямо крутят у виска.

Слово: «Если и будет приватизация, она будет открытой и честной. Никакой номенклатурной, клановой, как я сказал, и недобросовестной приватизации в стране не будет… Объекты будут продаваться только по конкурсу или через аукцион... Конкурировать между собой будут не фамилии или покровители, а бизнес–планы и социальные программы по поддержке трудового коллектива» (2007).

Дело: Насколько честна и прозрачна у нас приватизация, можно пронаблюдать на ряде недавних сделок. Достаточно припомнить продажу лакомого куска в центре Минска, который достался Оману за символическую сумму в 10 млн. долларов. Не менее «темной» оказалась и история с продажей госпакета акций СП МЦС (Velcom). Оглашения суммы вырученных средств пресса не могла добиться очень долго. В той же череде стоит и покупка швейцарской компанией Franck Muller часового завода «Луч»… Кстати, относительно последнего, слова тоже несколько разошлись с делом.

Слово: «Но главная задача здесь еще состоит и в том, чтобы сохранить это производство в стране. Оно исторически принадлежит нашей стране. Точно так по часовому заводу. Не знаю, чего там ждут и правительство и Павлов. Ждут, когда я приеду на часовой завод, губят его и дальше, некоторые говорят, давайте его закроем. Людей трудоустроим – не проблема. Вопрос не в этом – можно и МТЗ закрыть, и МАЗ закрыть. Так а с чем мы останемся? Это тоже наш брэнд. Сегодня часы, оказывается, в мире выпускают меньше стран, чем самолеты. Это высочайший уровень технологий».

Дело: Чем закончилось сохранение «брэнда», всем известно. Завод продали швейцарцам за 12,41 миллиона долларов. Эксперты назвали эту сделку полным абсурдом и предположили, что она нужна была только для того, чтобы прикрыть какие-то другие, которые не афишируются.

Слово: «С 1 апреля (2009 года – «С») в убыток работать преступно. Работа в убыток — это завтрашняя катастрофа. То же касается и работы на склад… Мы будем на корню пресекать попытки иждивенческих настроений у хозяйствующих субъектов».

Дело: На 1 февраля складские запасы составили 75,3%. При этом рост запасов зафиксирован во всех отраслях белорусской промышленности. С чистым убытком на конец 2009 года сработало каждое пятое предприятие — 18,6%. Сумма убытка составила 785,9 млрд рублей, или в 3,5 раза больше, чем в аналогичный период прошлого года. В общем, на лицо преступный замысел.

Слово: «С нынешнего года мы принципиально изменим подходы к оценке работы сельхозпредприятий. Сейте то, что будет приносить прибыль. Но на государственные дотации не рассчитывайте».

Дело: Слова о сокращении дотаций сельскому хозяйству звучат из уст президента с завидным постоянством. Между тем, по словам вице-премьера Ивана Бамбизы, только в 2009 году на аграрный сектор из бюджетов всех уровней было направлено 4,6 трлн рублей, что на 30% выше уровня 2008 года. Вместе с тем, несмотря на такую поддержку, рентабельности в сельхозорганизациях снизилась до 14,2% против 18,7% в предыдущем году, в том числе от реализации продукции — 4,2% против 6,3%. Это при том, что планы стояли амбициозные — обеспечить уровень рентабельности сельхозпроизводства не ниже 22-25%. Снизилась также чистая прибыль предприятий сельского хозяйства. Она составила 1,4 трлн рублей, или 86% к уровню 2008 года.

Слово: «Налоги призваны стимулировать плательщиков к легальной уплате налогов и сборов. Схема налогов должна быть простой и понятной» (2008 год).

Дело: Казалось бы, некоторые подвижки в этой области были сделаны. Однако в ноябре 2009 года Всемирный банк, Международная финансовая корпорация и PricewaterhouseCoopers опубликовали шестое ежегодное исследование «Уплата налогов 2010. Международный обзор». В рейтинге по простоте уплаты налогов Беларусь в очередной раз заняла последнее 183-е место.

Слово: «Основной вопрос, который будоражит наши умы: кто же будет строить станцию в Беларуси. Этот вопрос в кулуарах решаться не будет. Это будет открытый конкурс. Конечно, нам не хотелось бы – я уже послу России об этом говорил, — чтобы мы складывали яйца в одну корзину. Мы зависим и так по другим видам энергии от России, не хотелось бы зависеть и в строительстве АЭС только от Российской Федерации. Это я говорю честно. Мы хотели бы, чтобы АЭС построили, может быть, другие» (2007).

Дело: Как ни «противился» президент, а «честный» конкурс выиграли именно россияне. «Складированию яиц» существенно поспособствовал обещанный Россией под строительство АЭС кредит. А конкуренты отдыхают: «Слушайте, посмешище! Мы им предлагаем за блок почти два миллиарда долларов, а они перед нами ставят условия, какое у вас будет предвыборное законодательство...», — возмущался президент.

Слово: «Задача правительства, всех республиканских и местных органов управления — даже в условиях роста цен на энергоносители сохранить в этом году (2007-м – «С») положительную динамику снижения темпов инфляции и по итогам года выйти на целевые параметры, предусмотренные в прогнозе социально–экономического развития страны, — 6—8%».

Дело: Тогда по итогам 2007 года официальный рост потребительских цен составил 12,1%, или в 1,51 раза больше верхнего предела. Больше столь амбициозных задач президент не ставил.

Слово: «Сергей Сергеевич (Сидорский – «С»), надо возвращаться к требованию повышения заработной платы. Другого пути нет. На конец пятилетки нам надо заработную плату довести, боюсь говорить, до 700 долларов, никуда не денемся. 500 долларов будет мало. Надо 700 – среднюю зарплату по стране. Тогда мы сможем удержать стабильность в нашем обществе». (2008)

Дело: Похоже, не видать нам стабильности как своих ушей. Нынешняя средняя зарплата белоруса не то, что до 700, до 500 вряд ли дотянет. Во всяком случае, к концу 2010 года. Напомним, что в феврале начисленная средняя зарплата составила 1.016.393 рубля, или 346 долларов по текущему курсу. Хотя еще в конце 2008 года она равнялась 456 долларам США.

Слово: «Кто эти шесть человек, которых Запад назвал политическими заключенными? Двое осуждены за незаконное предпринимательство и неуплату налогов. Двое за хулиганство, один за незаконную деятельность и еще один за призыв к деятельности, направленной против страны... Мы приняли решение, что тему закрываем. Пятеро на свободе — шестой (видимо, президент имел в виду Александра Козулина — «С») отказался. Какие к нам претензии?»

Относительно освобождения последнего президент вообще разразился страшными пророчествами: «Нашли вшивого оппозиционера, полтора процента получившего на выборах, и сделали его политзаключенным. Оппозиция не хочет, чтобы его выпускали. Если он завтра выйдет на свободу, оппозиции той не будет. Святого нет в этом человеке ничего».

Дело: Как мы помним, пророчествам Александра Григорьевича не суждено было сбыться: Александр Козулин вышел на свободу, но угрозы для оппозиции явно не представлял. Да и сама оппозиция не очень-то противилась этому факту. Что же касается вопроса с политзаключенными, который президент якобы закрыл еще в 2008 году, то все идет к тому, что в 2010 году он снова может стать актуальным.

